...периода 1915–1917 гг. выходит за рамки местной, региональной ... искусств, являясь частью исторической памяти разных поколений ... связанных общей судьбой.


**Список использованных источников**

1. ..., И. Л. Живопись. Рисунок. Акварель: выст. К 100-летию со дня рождения: каталог. – Челябинск, 1991. – 67 с. : ил.
2. ... И. Л. Вандышева / публ. О. В. Субботиной и Е. Л. Степановой // Челябинск неизвестный: краевед. – Сб. : Челябинск, 2002. – Вып. 3. – С. 566
3. ...есть казак, который хорошо рисует...» (100-летие И. Л. Вандышева (1891–1964): ... // Вечерний Челябинск, 1991.
4. Трифонова, Г. С. Вандышев Игнатий Лукич // Челябинская область: энциклопедия. – Челябинск, 2003. – т. 1. – с. 564.



*Бабко А. І.,*
*БДУКМ, Мінск*


## ПРАБЛЕМА СУАДНОСІН ІДЭАЛУ І РЭАЛЬНАСЦІ Ў ДУХОЎНЫХ ПОШУКАХ АЛЕСЯ ГАРУНА

Праблема суадносін ідэалу і рэальнасці мае грунтоўнае значэнне ў духоўным жыцці чалавека і грамадства. Пэўнае яе вырашэнне істотным чынам уплывае на дзейнасць індывідуальных і калектыўных суб'ектаў. Таму цалкам натуральна, што яна трывала замацавалася сярод «вечных» тэм філасофіі, што яе нельга выключыць з мастацкіх практык і іх тэарэтычнага апісвання.

Істотнае месца згаданая праблема займае і ў творчых пошуках Алеся Гаруна. Важнасць разгляду дадзенага кірунку яго духоўнага самаразвіцця вызначаецца найперш тым, што паэт належыць да герояў нашага нацыянальнага Адраджэння. Таму кожны, няхай сабе нават невялічкі, крок наперад у вывучэнні яго мастацкага даробку, яго светапогляду і жыццёвага шляху спрыяе падтрыманню і разгортванню беларускай адраджэнскай традыцыі. Разам з тым даследаванне, інтэрпрэтацыя і тэарэтычная рэканструкцыя дадзенага аспекту яго духоўнай спадчыны мае высокае агульначалавечае значэнне, бо намаганні Алеся Гаруна, скіраваныя на высвятленне адпаведных пытанняў і здзяйсненне адпаведных стратэгій, з'яўляюцца неад'емнай часткай тэарэтычнай і практычнай працы ўсяго чалавецтва. Пры гэтым ні ў якім разе нельга пакінуць па-за ўвагай той момант, што паэт узняўся на такі ўзровень, дзе выпакутаваныя ідэалы не толькі ўрачыста абвяшчаюцца, але і паслядоўна здзяйсняюцца ў напружанай штодзённай працы.

Алесь Гарун зусім маладым далучыўся да рэвалюцыйнай барацьбы, і гэты жыццёвы выбар выяўляе пэўнае разуменне ім суадносін належнага і існага ў адпаведных канкрэтных умовах: непрыманне мярзотнай

рэчаіснасці, супрацьпастаўленне ёй высокага ідэалу і палкае памкненне да яго здзяйснення. Як даводзіць Антон Адамовіч, спасылаючыся на асабістае сведчанне Язэпа Лёсіка, большую частку свайго рэвалюцыйнага шляху паэт прайшоў у шэрагах сацыял-дэмакратаў, падзяляючы погляды меншавіцкага крыла дадзенай партыі [1, с. 1076]. Даследчык указвае, што прыхільнасць да марксізму знайшла пэўны адбітак у Гаруновай паэзіі (а таксама публіцыстыцы) [1, с. 1076–1077]. Аднак, пагадзіўшыся з тым, што ідэі Маркса не былі Алесю Гаруну чужымі, неабходна падкрэсліць, што зусім чужым і абсалютна непрымальным для яго быў сляпы, дагматычны марксісцкі фанатызм.

У кантэксце вылучанай намі праблемы пазіцыя паэта супадае з пазіцыяй Маркса ў сваёй прынцыповай «антыўтапічнай» скіраванасці. Высока ацэньваючы інтэлектуальны патэнцыял прадстаўнікоў утапічнага сацыялізму, ён указвае разам з тым, што гэтыя «людзі вялікай аналітычнай моцы ... рабіліся дзяцьмі, як толькі пачыналі думаць аб будучыні» [2, с. 349]. Паэт лічыць, што ўтапізм, як дамоклаў меч, вісіць над розумамі палымяных, адданых высокім ідэалам рэвалюцыянераў праз іх палкае памкненне да справядлівага грамадскага ладу, якое пры кожным больш-менш удалым кроку ў змаганні за гэты лад можа спарадзіць ілюзію яго хуткага ўсталявання. Той, хто паддаўся такой ілюзіі, гатовы «адступіць і ад гістарычнай праўды, і ад правідловага спосабу разумавання» [2, с. 349]. Падобнага кшталту аблуду Алесь Гарун фіксуе ў Энгельса і ў бальшавікоў [2, с. 348–350]. Што да апошніх, дык паэт разгледзеў пэўную яе праяву у іх стаўленні да нацыянальнага пытання, у памкненні зліквідаваць рэальныя міжнацыянальныя адрозненні як найхутчэй, бо ўжо «заступіла на зямлю святая вестка ўсясветнага брацтва» [2, с. 350].

Антыподам утапізму з'яўляецца рэалізм, патрабаванне дакладнага, усебаковага, глыбокага выяўлення характару канкрэтнай гістарычнай сітуацыі, а таксама дзеянняў, што яму адпавядаюць. Прынцып дзейнага, актыўнага рэалізму з'яўляецца ключавым у пазіцыі Алеся Гаруна датычна нашай праблемы (у гэтым плане яго падыход блізкі да ідэй Маркса, для якога камунізм быў не адарваным ад рэчаіснасці ўяўленнем, а рэальным рухам, скіраваным на пераадоленне існага грамадскага ладу [3, с. 336]). Змаганне за здзяйсненне высокага духоўнага ідэалу на індывідуальным, нацыянальным і агульначалавечым узроўнях зрабілася справай жыцця паэта. Ён быў перакананы, што згаданае здзяйсненне можа быць дасягнута толькі праз нястомную працу на грунце строгага ўліку тых варункаў, у якіх яна адбываецца, і дзейнічаў у адпаведнасці з гэтым перакананнем. Яскравы прыклад рэалізацыі згаданай стратэгіі ў палітычнай дзейнасці Алеся Гаруна мы знаходзім ва ўспамінах Антона Аўсяніка. У адказ на прапановы некаторых беларускіх палітыкаў разгортваць рэвалюцыйны рух, нягледзячы на нямецкі акупацыйны рэжым, і нават узнімаць народ на ўзброеную барацьбу супраць немцаў, ён даведаў на сесіі Рады Рэспублікі, на якой прысутнічаў аўтар успамінаў: «А ці падумалі тыя, якія раюць гэта рабіць і сваімі харошымі прамовамі і другіх да гэтага шалёнага ўчынку падбухторваць, што магло б стацца, каб сапраўды наш селянін

з голымі рукамі пайшоў біцца з немцам? Ці падумалі аб тым, што мітынговыя прамовы пара скончыць, што трэба цяперака займацца не прамовамі, а трэба, па маёй думцы, разважаць аб тым, як пачаць і з чаго распачаць нашае дзяржаўнае будаўніцтва» [2, с. 390].

На ідэнтычным падмурку разгортвалася і мастацкая творчасць Алеся Гаруна, таксама ўлучаная ў працэс барацьбы за здзяйсненне высокага духоўнага ідэалу. У вершы «Паэту» ён заклікае майстроў слова спяваць не аб «праўдзе тэй, што будзе,» і не аб «праўдзе тэй, што ў небе» [2, с. 127], а аб рэальным гаротным лёсе людзей, каб узмацніць адчуванне імі непрымальнасці існуючага стану рэчаў і імкненне пераадолець яго: «Тагды, убачыш сам, парвуцца духа путы//І будзе ясны дзень да нас тагды бліжэй» [2, с. 128].

У іншым вершы-звароце («Муляру») паэт заклікае свайго ўяўнага суразмоўцу (а ў яго асобе ўсё чалавецтва) да супольнай працы дзеля пабудовы вольнага, справядлівага і заможнага грамадства. Пры гэтым ён робіць мастацкі накід новага ладу, выкарыстоўваючы метафару мура, што павінен адмяжоўваць прыгожае прышлае ад брыдкага мінулага і што падаецца ім як «мур вялікі, вольнай волі,//Мур высокі да нябёс,//Мур братэрства, роўнай долі,//Мур для радасці без слёз…» [2, с. 66]. І выглядае на тое, што, малюючы карціну грамады, якая натхнёна працуе дзеля здзяйснення высокага духоўнага ідэалу, паказваючы ў паэтычнай, вобразнай форме вынік гэтай працы, ён адступае ад рыгарыстычнай рэалістычнай мастацкай праграмы, абвешчанай ім у вершы «Паэту».

Вырваўшы памянёныя творы з агульнага кантэксту творчай спадчыны Алеся Гаруна, тут можна ўбачыць праяву яго ваганняў датычна адпаведнай мастацкай стратэгіі ці непаслядоўнасці ў яе рэалізацыі. Аднак калі разглядаць іх у згаданым кантэксце, дык паўстае зусім іншае ўражанне, уражанне іх узаемадапаўняльнасці. Сапраўды, паэт пакінуў нам шмат твораў, у якіх на адрас грамадскіх рэалій гучыць бязлітасная крытыка. Разам з тым ён паказаў, што праз змаганне, праз працу, праз творчыя высілкі, скіраваныя на пераадоленне брыдкага, мярзотнага, ліхога, вымалёўваецца ўжо яго альтэрнатыва. Мастацкае яе ўвасабленне – гэта таксама форма барацьбы супраць пачварнага, супраць несправядлівасці, супраць ужывання чалавека іншым чалавекам як сродку дзеля рэалізацыі эгаістычных намераў. Толькі ні ў якім разе згаданае ўвасабленне не павінна вырывацца з кантэксту канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасці і дзейнасці.

Той момант, што карціна вольнага, шчаслівага грамадства, у якім чалавек «без бяды, без жуды будзе жыць-панаваць, весяліцца» [2, с. 47], патрабуе спецыяльнага асэнсавання з пункту гледжання яго жыццяздольнасці, толькі вымалёўваецца з твораў паэта. Пытанні адносна завяршальнага характару такога грамадства (сапраўды, ці не з'яўляецца яно «канцом» – канцом гісторыі, філасофіі, чалавека, бо «няма пакуты дзе – няма пазнання» [2, с. 124]?), не маглі быць ключавымі для яго. Жывучы ў эпоху жахлівых сацыяльных катаклізмаў, ён цудоўна ўсведамляў, што да «канца гісторыі»

(ці перадгісторыі) яшчэ вельмі і вельмі далёка («Мо праз век чалавек//Да вялікага жыцця ўстане» [2, с. 46]). Актуальнымі ў такіх варунках ён лічыў праблемы, звязаныя са стварэннем перадумоў справядлівага грамадскага ладу, да якіх належала і мастацкая апрацоўка агульнага ўяўлення пра яго.

Алесь Гарун выявіў таксама неабходнасць нерацыянальнага, пачуццёвага аспекту ў памкненні да ідэалу. Невялікі па памеры, але надзвычай глыбокі і багаты на змест твор, які аўтар ідэнтыфікаваў як легенду і які называецца «Першы снег», завяршаецца словамі: «Дык ідзіце ўсюды і кажыце ўсім, што па першым снягу будзе другі снег!» [2, с. 223]. Першы, некрануты, бялюткі снег сімвалізуе ў ім прыгажосць і маральную чысціню. Аднак у нялюдскім свеце прыгожае і светлае робіцца ахвярай агідных, нядобрых сіл, якраз як і снег змешваецца з брудам, калі яго бязлітасна «топчуць нагамі». Такі стан рэчаў, аднак, нявечны: будзе другое прышэсце снегу! Стылявая форма згаданага твора, якая ўпадабняе яго сакральнаму тэксту, выступае як сродак для таго, каб падкрэсліць істотнае значэнне веры ў ідэал, у магчымасць яго здзяйснення. Паэт ясна разумеў і пераканальна раскрыў супярэчлівасць рэчаіснасці, надзвычайную складанасць жыцця. Нават духоўна моцны чалавек, герой, нязломны змагар могуць зведаць хвіліны паняверкі, слабасці, няўпэўненасці. У такія моманты ідэал успрымаецца як адсунуты у далёкую прышласць, востра адчуваецца і перажываецца немагчымасць яго здзяйснення ў індывідуальным і грамадскім жыцці, якое мусіць падпарадкавацца ганебнай рэальнасці (падобныя перажыванні з магутнай мастацкай сілай перадаюцца паэтам у вершы «Ноч» [2, с. 46–47]). Найхутчэй пераадолець такога кшталту стан чалавеку дапаможа розум у непарыўнай сувязі з верай у неадольную моц высокага духоўнага ідэалу, які не заслугоўваў бы свайго імя, калі б заставаўся ва ўлонні бяздзейных утапічных жаданняў.

Падсумоўваючы даведзенае вышэй, неабходна адзначыць дыялектычны характар поглядаў Алеся Гаруна. Паэт разглядаў ідэал і рэальнасць як непарыўна звязаныя адно з адным. Разам з тым ён ясна ўсведамляў няпростую, супярэчлівую натуру іх адзінства, і згаданае ўсведамленне спрыяла глыбокаму непрыманню ім валюнтарысцкіх захадаў у тэорыі і практыцы. Разумеючы, што здзяйсненне ідэалу – гэта канкрэтная штодзённая праца ў адпаведнасці з рэальнымі ўмовамі, Алесь Гарун няўхільна прытрымліваўся дадзенага прынцыпу ў сваёй грамадска-палітычнай і мастацкай дзейнасці. Непахісная паслядоўнасць паэта ў змаганні за здзяйсненне высокага духоўнага ідэалу ў індывідуальным жыцці, у развіцці нашага народа і ў агульначалавечым маштабе – яго наймацнейшы аргумент на карысць выпакутаваных ім поглядаў.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. Адамовіч, А. Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Менск: Выд. Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.
2. Гарун, Алесь Выбраныя творы / Алесь Гарун. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 2003. – 448с.

1. Fiebach, J. Ästhetik heute / J. Fiebach [und and. ] – Berlin: Dietz Verlag, 1978. – 532 S.

*Березкина Л. В.,*
*БГАИ, Минск*

## НОВАЯ МОДЕЛЬ НАЦИОНАЛЬНОЙ СИСТЕМЫ КВАЛИФИКАЦИЙ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ

Рассогласование спроса работодателей на квалифицированные кадры, соответствующих задачам компаний, и недостаточный уровень знаний, умений выпускников, субъективность внутренней аттестации персонала, явились предпосылками возникновения национальной системы квалификаций (НСК). Её задача – повышение производительности труда через развитие квалификаций работников.

Ключевое слово в НСК – система. Системность понимается не только как набор инструментов, куда входят профессиональные стандарты, государственные информационные ресурсы, профессионально-общественная аккредитация образовательных программ, независимая оценка квалификаций, но и взаимодействие участников в решении общих зада подготовки кадров.

Именно системность позволяет работодателям влиять на подготовку выпускников, оценку квалификации сотрудников, а профессиональному образованию – готовить специалистов, нужных работодателю, с учётом требований профессиональных стандартов; актуализировать программы подготовки в соответствии с технологическими изменениями и потребностями в метакомпетенциях (soft skills).

НСК даёт предпринимательскому сообществу инструменты влияния на рынок труда и рынок образовательных услуг для подготовки и получения специалистов необходимой квалификации, вводит единичные методические подходы.

Технологичность современного мира строится на знаниях, умениях и навыках работников, призванных решать те или иные производственные, административные и творческие задачи. Поэтому системе подготовки кадров отводится одна из ведущих ролей в НСК.

На современном этапе профессиональное и высшее образование претерпевает закономерные изменения, продиктованные необходимостью насытить рынок труда специалистами, обладающими актуальными навыками. Таким образом, приоритетной задачей выступает расширение взаимодействия образования и работодателей, у большинства которых многие вопросы не теряют своей актуальности. Чему учили и что умеет выпускник учреждения среднего уровня профессионального образования, бакалавр, специалист, магистр? Диплом об окончании колледжа или вуза также не даёт ответов на эти вопросы.